НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

# ЗДАБЫТКІ

## ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ПОМНІКІ НА БЕЛАРУСІ

ВЫПУСК 24

Мінск 2021

УДК 002.2
ББК 78.56 + 78.36
З46

Складальнікі:
Т. А. С а п е г а, А. А. С у ш а, К. В. С у ш а

Рэдакцыйная калегія:
Р. С. М а т у л ь с к і, доктар пед. навук (гал. рэд.), Г. Я. Г а л е н ч а н к а, доктар гіст. навук, А. А. Г у ж а л о ў с к і, доктар гіст. навук, Л. Г. К і р у х і н а, Г. У. К і р э е в а, Т. В. К у з ь м і н і ч, канд. пед. навук, У. Ф. М а р т ы н а ў, доктар культуралогіі, А. І. С м о л і к, доктар культуралогіі, С. В. С н а п к о ў с к а я, доктар пед., гіст. навук, А. А. Суша, кандыдат культуралогіі

Рэцэнзенты:
Ю. А. Л а б ы н ц а ў, доктар філ. навук,
Н. Ф. В ы с о ц к а я, доктар мастацтвазнаўства

Адказны за выпуск К. В. С у ш а

З46 **Здабыткі** : дакументальныя помнікі на Беларусі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнікі: Т. А. Сапега, А. А. Суша, К. В. Суша. – Мінск, 2021. – Вып. 24. – 283 с.

Чарговы зборнік навуковых прац Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працягвае публікацыю матэрыялаў па праблемах дакументальных помнікаў на Беларусі, іх даследаванняў і ўводзіць у навуковы ўжытак дакументы, факты і звесткі, звязаныя з гісторыяй кнігі і культуры Беларусі.

Зборнік уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па педагагічных, гістарычных навуках і культуралогіі.

**УДК 002.2**
**ББК 78.56 + 78.36**

**ISSN 1726–5800**

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», 2021

*З М Е С Т*

Ад складальнікаў . . . . . . . . . . 6

## Тэорыя кнігазнаўства

*Доўнар Л.І.* Злучаючы перарваныя кнігазнаўчыя традыцыі: да 235-годдзя з дня нараджэння Іаахіма Лялевеля (1786–1861) . . . . . . . . . . 8

*Іаахім Лялевель.* Прамова да маіх бібліяграфічных кніг. Што такое бібліяграфія . . . . . . . . . . 17

## Рукапісная спадчына

*Сліж Н.У.* Планетнік пачатку 1490-х гг. з рукапісу з Супрасльскага манастыра . . . . . . . . . . 28

## Друкаваная спадчына

*Мужыла Н.В.* «Opera nova Battistae Mantuani Carmelitae» (з фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі) . . . . . . . . . . 47

*Лаўрык Ю.М.* Да пытання пра дзейнасць першай берасцейскай друкарні: храналогія заснавання, склад і характарыстыка выдавецкай прадукцыі . . . . . . . . . . 54

*Шопіна М.М.* Кніжная спадчына беларускіх вандроўнікаў XVI–XIX стст. у фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі . . . . . . . . . . 70

*Лішай Д.У.* Выкарыстанне беларускага друкаванага слова ў агітацыйных мэтах падчас маніфестацыйнага перыяду 1861–1862 гг. . . . . . . . . . . 80

*Верас Н.Я.* Калекцыя лістовак навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі . . . . . . . . . . 90

## Гістарычныя кнігазборы

*Заблоцкая Т.М.* Бібліятэкі пры кляштарах ордэна піяраў на беларускіх землях (сярэдзіна XVIII – першая палова XIX ст.) . . . . . . . . . . 104

*Палунчанка В.М.* Бібліятэчны каталог Нясвіжскай павятовай школы ад 30 сакавіка 1786 г. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
*Булаты П.Ю.* Прыватная бібліятэка ляхавіцкага плябана Вінцэнта Супіньскага: характарыстыка кніжнага фонду (1825) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129

## Правененцыі

*Сцебурака А.М.* Атлас Сансона-сына «Еўропа» 1648 г. з бібліятэкі абата Рышэлье . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
*Пахоменкова С.Г.* Книга с суперэкслибрисом маркиза д’Отфора и ее владельцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154
*Сільнова Л.Д.* «Дарагому Аляксандру Дзітлаву, з якім сябруем сотню гадоў»: кнігі з дароўнымі надпісамі народных пісьменнікаў Беларусі з бібліятэкі фатографа А.С. Дзітлава (з гісторыі фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 162

## Гісторыя кнігі

*Кузьмініч Т.В.* Нацыянальная бібліяграфія Беларусі на этапе інтэнсіўнага стварэння друкаванай прадукцыі: 1960–1980-я гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 185
*Іванова Л.С.* Выкарыстанне кнігі Мікалая Рэя «Звярынец» у судовых справах Гарадзенскага земскага суда ў канцы XVI ст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 196
*Максимчук О.В.* На пересечении божественно мудрого и человеческого: аллегория прекрасной Мудрости в творчестве Фомы Иевлевича . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 200
*Крывалап А.Д.* Двухтомнік Яўстаха Тышкевіча «Вобразы побытавага жыцця ў Літве» як артэфакт культуры штодзённасці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212

## Мастацтва кнігі

*Трифонова Н.Я.* Экземпляр «Постиллы» XVI в. в собрании Национального художественного музея Республики Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 222

## Персаналіі

*Ярошевич-Переславцев З.* Книжное наследие Франциска Скорины в Польше . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 226
*Пожарицкий М.Б.* Философские идеи Франциска Скорины в контексте персонального книговедения . . . . . . . . . . . . . . . . 235
*Берёзкина Н.Ю.* Отражение деятельности Я.О. Наркевича-Иодко в печати: по материалам конца XIX – начала XX в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 247
*Міцкевіч М.М.* Рукапісная і друкаваная спадчына Якуба Коласа ў Беларускай бібліятэцы і музеі імя Францішка Скарыны ў Лондане . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 255
*Лаўрык Т.А.* Вячаслаў Адамовіч (Дзяргач): рэальная асоба і яе мастацкае ўвасабленне ў рамане Леаніда Дайнекі «Ілоты» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 269

Звесткі аб аўтарах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 281

## *АД СКЛАДАЛЬНІКАЎ*

Нацыянальная бібліятэка Беларусі праводзіць шматпланавую дзейнасць па вывучэнні і папулярызацыі нацыянальнай кніжнай спадчыны. Важным напрамкам гэтай дзейнасці з'яўляецца публікацыя даследаванняў па гісторыі кніжнай культуры Беларусі. Гэтай мэце ўжо 26 гадоў служыць зборнік «Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі», які быў заснаваны ў 1995 г. і на сёння з'яўляецца вядучым навуковым выданнем Рэспублікі Беларусь у галіне кнігазнаўства. Матэрыялы зборніка адлюстроўваюць дасягненні беларускай кнігазнаўчай навукі ў кантэксце сусветных тэндэнцый развіцця бібліялогіі і накіраваны на асэнсаванне здабыткаў шматвяковай гісторыі беларускай кніжнай культуры.

За час свайго плённага існавання выданне стала грунтоўнай платформай для даследчыкаў кніжнай культуры. На яго старонках публікуюцца матэрыялы кнігазнаўчага, бібліятэказнаўчага, мастацтвазнаўчага, гістарычнага, культуралагічнага характару. У артыкулах зборніка прадстаўлены вынікі даследавання рукапіснай і друкаванай спадчыны, адкрываюцца новыя старонкі гісторыі кніжнай і бібліятэчнай справы ў Беларусі, уводзяцца ў навуковы ўжытак унікальныя кніжныя помнікі, раскрываюцца калекцыі рукапісных, старадрукаваных і рэдкіх кніг, што захоўваюцца ў фондах бібліятэк, музеяў, архіваў Беларусі і замежных краін. У фокусе ўвагі аўтараў таксама пытанні мастацтва кнігі, бібліяфільства, гістарычных кнігазбораў і правененцый.

Дваццаць чацвёрты выпуск зборніка змяшчае артыкулы, якія ўводзяць у навуковы ўжытак новыя матэрыялы, звязаныя з гісторыя кніжнай культуры Беларусі. Працягваецца публікацыя даследаванняў, прысвечаных беларускаму першадрукару Францыску Скарыну: у зборніку змешчаны аналітычны агляд польскіх навуковых прац на тэму жыцця і дзейнасці Ф. Скарыны, апісанне яго друкаванай спадчыны, што захоўваецца сёння ў польскіх кнігазборах, асэнсаванне філасофскіх ідэй і светапогляду беларускага першадрукара. Пад увагай аўтараў зборніка таксама іншыя выданні ранняга перыяду кнігадрукавання – палеатып «Opera nova Battistae Mantuani Carmelitae» з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і кнігі першай берасцейскай друкарні Берната Ваяводкі. Публікацыя астралагічнага твора «Планетнік», змешчанага ў супрасльскім рукапісе «Арыстоцелевы вароты, ці Тайна тайных», суправаджаецца навуковым аналізам гэтага тэксту.

Да 235-годдзя з дня нараджэння Іаахіма Лялевеля распачынаецца публікацыя яго кнігазнаўчай працы «Прамова да маіх бібліяграфічных кніг. Што такое бібліяграфія» ў перакладзе на беларускую мову, выкананым даследчыцай Л.І. Доўнар. Змешчаны артыкулы, прысвечаныя рукапіснай і друкаванай спадчыне выдатных дзеячаў беларускай культуры – Якуба Коласа, Якуба Наркевіча-Ёдкі, Вячаслава Адамовіча. Даследуюцца кнігі знакамітых беларускіх вандроўнікаў XVI–XIX стст. – прадстаўнікоў родаў Радзівілаў, Сапегаў, Ельскіх, навукоўцаў Іосіфа Гашкевіча, Бенедыкта Дыбоўскага. Разглядаецца выпуск беларускай нелегальнай літаратуры ў маніфестацыйны перыяд 1861–1862 гг., аналізуецца калекцыя лістовак розных гістарычных прамежкаў часу з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

У матэрыялах зборніка асвятляецца лёс беларускіх гістарычных кнігазбораў: кляштарных бібліятэк ордэна піяраў, бібліятэкі Нясвіжскай павятовай школы, прыватнай кніжнай калекцыі ляхавіцкага плябана Вінцэнта Супіньскага. У шэрагу артыкулаў разглядаюцца правененцыі і аўтографы як каштоўныя складнікі гісторыі бытавання кнігі: вывучаецца лёс рарытэтных французскіх старадрукаў з гербавымі суперэкслібрысамі абата Рышэлье і маркіза д'Атфора, а таксама выданняў з дароўнымі надпісамі народных пісьменнікаў Беларусі з прыватнай бібліятэкі фатографа А.С. Дзітлава. Разглядаецца бытаванне і выкарыстанне, шматмерныя сувязі з культурай свайго часу зборніка сатырычных эпіграм «Звярынец» Мікалая Рэя, алегарычнай паэмы «Лабірынт» Тамаша Яўлевіча, зборніка апавяданняў і падарожных занатовак «Вобразы побытавага жыцця ў Літве» Яўстаха Тышкевіча. Прааналізаваны асаблівасці мастацкага афармлення зборніка пропаведзяў «Пасціла» Якуба Вуйка. Таксама надрукаваны артыкул, прысвечаны вывучэнню развіцця беларускай нацыянальнай бібліяграфіі ў 1960–1980-я гг. У матэрыялах зборніка раскрываюцца кніжныя калекцыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і іншых беларускіх і замежных навуковых бібліятэк і музеяў.

Артыкулы размешчаны па тэматычных раздзелах: «Тэорыя кнігазнаўства», «Рукапісная спадчына», «Друкаваная спадчына», «Гістарычныя кнігазборы», «Правененцыі», «Гісторыя кнігі», «Мастацтва кнігі», «Персаналіі». Сярод аўтараў зборніка – навукоўцы, спецыялісты бібліятэк і музеяў, выкладчыкі ВНУ з Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы.

Зборнік адрасаваны кнігазнаўцам, гісторыкам, філолагам, культуролагам, спецыялістам бібліятэк, музеяў і архіваў, а таксама бібліяфілам і ўсім, хто цікавіцца беларускай і сусветнай кніжнай спадчынай.

## ЗВЕСТКІ АБ АЎТАРАХ

БУЛАТЫ Павел Юр’евіч – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у турызме і гасціннасці Інстытута менеджменту спорту і турызму Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры (Мінск, Беларусь)

БЯРОЗКІНА Наталля Юр’еўна – кандыдат гістарычных навук, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, дацэнт кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (Мінск, Беларусь)

ВЕРАС Нэлі Яўгеньеўна – магістр гуманітарных навук, загадчык сектара абслугоўвання навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (Мінск, Беларусь)

ДОЎНАР Ларыса Іосіфаўна – кандыдат педагагічных навук, прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (Мінск, Беларусь)

ЗАБЛОЦКАЯ Таццяна Міхайлаўна – метадыст навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, аспірант Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы (Мінск, Беларусь)

ІВАНОВА Людміла Сяргееўна – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытных актаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск, Беларусь)

КРЫВАЛАП Аляксей Дзмітрыевіч – кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (Мінск, Беларусь)

КУЗЬМІНІЧ Таццяна Васільеўна – кандыдат педагагічных навук, дацэнт, намеснік генеральнага дырэктара – дырэктар па інфармацыйных рэсурсах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, (Мінск, Беларусь)

ЛАЎРЫК Таццяна Анатольеўна – магістр філалагічных навук, загадчык інфармацыйна-аналітычнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (Мінск, Беларусь)

ЛАЎРЫК Юрый Мікалаевіч – магістр тэалогіі, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (Мінск, Беларусь)

ЛІШАЙ Дзмітрый Уладзіміравіч – магістр гістарычных навук, аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (Мінск, Беларусь)

МАКСІМЧУК Вольга Васільеўна – кандыдат філалагічных навук, навуковы супрацоўнік аддзела старадрукаваных і рэдкіх выданняў Інстытута кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Украіны імя У.І. Вярнадскага (Кіеў, Украіна)

МІЦКЕВІЧ Марыя Міхайлаўна – старшыня Дзіцячага фонду духоўнага і культурнага адраджэння «Сакавік» (Мінск, Беларусь)

МУЖЫЛА Наталля Віктараўна – бібліёграф І катэгорыі навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (Мінск, Беларусь)

ПАЖАРЫЦКІ Міхаіл Багданавіч – бібліятэкар І катэгорыі аддзела абслугоўвання Навуковай бібліятэкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, саіскальнік аспірантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (Гродна, Беларусь)

ПАЛУНЧАНКА Вольга Мікалаеўна – вядучы бібліёграф аддзела даведачна-інфармацыйнага абслугоўвання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (Мінск, Беларусь)

ПАХОМЕНКАВА Святлана Рыгораўна – галоўны бібліёграф навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (Мінск, Беларусь)

СІЛЬНОВА Людміла Данілаўна – галоўны бібліёграф навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (Мінск, Беларусь)

СЛІЖ Наталля Уладзіміраўна – кандыдат гістарычных навук, незалежны даследчык (Гродна, Беларусь)

СЦЕБУРАКА Анатоль Мікалаевіч – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы (Мінск, Беларусь)

ТРЫФАНАВА Наталля Якаўлеўна – кандыдат мастацтвазнаўства, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь (Мінск, Беларусь)

ШОПІНА Марыя Міхайлаўна – магістр гуманітарных навук, загадчык сектара арганізацыі кніжных выставак аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (Мінск, Беларусь)

ЯРАШЭВІЧ-ПЕРАСЛАЎЦАЎ Зоя – доктар хабілітаваны, прафесар Вармінска-Мазурскага ўніверсітэта ў Ольштыне (Ольштын, Польшча)

Навуковае выданне

# ЗДАБЫТКІ

Дакументальныя помнікі на Беларусі

*Выпуск 24*

Складальнікі
**Сапега** Таццяна Андрэеўна
**Суша** Аляксандр Аляксандравіч
**Суша** Ксенія Віктараўна

*На беларускай і рускай мовах*

Рэдактар Н. Я. Анапрэенка
Адказны за выпуск К. В. Суша
Камп’ютарная вёрстка М. І. Аляксандравай
Дызайн вокладкі Н. Л. Наўроцкай

Падпісана ў друк 30.06.2021. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Лічбавы друк.
Гарнітура Таймс. Умоўн. друк. арк. 16,51. Ул.-выд. арк. 12,70.
Тыраж 100 экз. Заказ 1045.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/398 ад 02.07.2014.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/157 ад 02.07.2014.

Пр. Незалежнасці, 116, 220114, Мінск.
Тэл. (+375 17) 293 27 68. Факс (+375 17) 266 37 23. E-mail: edit@nlb.by.